Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2014 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Дня абароны дзяцей

**2 чэрвеня**

Забаўляльная праграма «Свята са смакам дзяцінства», прысвечаная Дню абароны дзяцей. Канцэртная праграма, розныя конкурсы і віктарыны, і, вядома ж, прызы не пакінулі абыякавымі ні дзяцей, ні дарослых.

*Арэхаўская СБ, 30 чал.*

**3 чэрвеня**

Свята дзяцінства “Праздник детства, праздник солнца, праздник лета”. У праграме:
-віншавальнае слова бібліятэкара са святам дзяцінства
- прагляд лялечнага спектакля “Слагаемые здоровья”
- гульнёвая праграма “Вясёлыя канікулы”

*ДБ, 23 чал.*

**6 чэрвеня**

Адкрылася "Школа маладых мам". Бацькі пазнаёміліся з педагагічнай, медыцынскай, прававой, энцыклапедычнай літаратурай аб дзецях з фондаў бібліятэкі. Ім былі прадстаўлены прававыя сайты па абароне дзяцінства і мацярынства, а таксама прадстаўлена медыяпрэзентацыя пра гісторыю свята. Маладыя мамы выказалі свае прапановы і пажаданні аб рабоце "Школы ...".

*Дзівінская ДБ, 10 чал.*

**11 чэрвеня**

У рамках раённага семінара, арганізаванага Кобрынскім ЗАГСам Гарадзецкая СБ арганізавала свята сям'і "Складаемыя сямейнага шчасця". На свята былі запрошаны сямейныя дынастыі Папроцкіх, Стахейка, шматдзетныя сем'і Івановых і Кугач. Да правядзення свята была падрыхтавана кніжная выстава "Калі ў доме лад - не патрэбен і скарб" і фотавыстава "Сямейныя гісторыі". Дзеці падарылі музычныя нумары для сямейных юбіляраў. Завяршылася свята ўручэннем памятных сувеніраў ад Грушэўскага РМЗ, ААТ "Гарадзец-агра", ПУП "Гарадзецкі" і Гарадзецкай сярэдняй сада-школы.

Гарадзецкая СБ, 50 чал.

**23 чэрвеня**

Сумесна з работнікамі Лукского ДК арганізавана свята дзяцінства "За 90 дзён лета вакол свету". Для дзяцей са школьнага лагера Лукской СШ ў тэатралізаванай форме былі праведзены конкурсы, гульні і віктарыны. Самымі актыўнымі ўдзельнікамі свята сталі Давідовіч Віка, Багдановіч Мікіта, Шпак Аляксандра, Нічыпарук Валерыя, якія атрымалі салодкія прызы. Юнакам былі прадстаўлены выставы-прагляды літаратуры "Па казачным сцяжынках", "Навіны з кніжнай паліцы", а затым для запрошаных работнікі СДК правялі дзіцячую дыскатэку.

*Лукская СБ, 25 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы і выдавецкая дзейнасць

**6 чэрвеня**

Напярэдадні юбілейнай даты – 215-годдзя з дня нараджэння Пушкіна - на абанеменце цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавана юбілейная фотавыстава “…И Пушкин с Белой Русью обручён”.. Нашчадкі Пушкіна з 19 ст. аселі на беларускай зямлі.

Беларускія рэаліі пакінулі свой след і ў творчасці Пушкіна. Аб гэтым у кнігах, артыкулах з перыядычных выданняў, прадстаўленых на фотавыставе “…И Пушкин с Белой Русью обручён”.

*ЦБ*

**8 чэрвеня**

Свята вуліцы «Хай на Тройцу ўсе сэрцы адкрыюцца». На святе былі ўзнагароджаны лепшыя чытачы бібліятэкі ў намінацыях «Библиотечный завсегдатай», «Самый щедрый даритель», «Обозреватель прессы», «Леди любовного романа», «Читаем всей семьёй», «Любитель журналов» и т. д.

*Кіселявецкая СБ, 30 чал.*

**13 чэрвеня**

Аддзелам маркетынгу ЦБ праведзены чарговыя заняткі ў відэашколе прафесійнага навучання «Лето с книжным рюкзаком», прысвечаныя арганізацыі працы з дзецьмі ў летні перыяд. У рамках заняткаў была прадстаўлена відэакансультацыя арганізацыіі дзейнасці аматарскіх клубаў пры бібліятэках, падрыхтаваная маладым спецыялістам АБМ Мілашук Т.І. Сельскія бібліятэкары абмяняліся сваімі напрацоўкамі па працы з дзецьмі і падлеткамі, а заг. аддзелам маркетынгу Галавейка Т.А. прадставіла электронную прэзентацыю па тэме сустрэчы.

*ЦБ*

**18 чэрвеня**

На абанеменце цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавана выстава “Рыцар сумлення і свабоды”, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Васіля Быкава, а таксама з часу 40-годдзя атрымання пісьменнікам Дзяржаўнай прэміі СССР.

*ЦБ*

**20 чэрвеня**

Бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі выдадзены бібліяграфічны паказальнік “Хатыні вогненныя сёстры”, прысвечаны спаленым у гады Вялікай Айчыннай вайны вёскам Кобрынскага раёна. У журботным спісу спаленых вёсак, падобна Хатыні, ёсць і вёскі Кобрынскага раёна.

Бібліяграфічны паказальнік адрасуецца ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, мінулым, гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.
Выданне ілюстравана. Бібліяграфічны спіс складае больш за 40 крыніц.

*ЦБ*

**20 чэрвеня**

У рамках пятага прафесійнага візіту бібліятэкараў Барысаўскага раёна "Бібліятэка як фактар захавання культуры: інавацыйная дзейнасць публічных бібліятэк рэгіёну ва ўмовах Года гасціннасці" адбылося наведванне ўстаноў культуры г. Кобрына - парку культуры і адпачынку ім. Суворава, цэнтральнай раённай бібліятэкі, Палаца культуры, ваенна-гістарычнага музея.

ЦБ

**20 чэрвеня**

Гадзіна бібліятэрапіі “Жыццё, выяўленае лёсам”. У праграме:

- абмяркоўванне жыццёвага і творчага шляху В. Быкава;
- чытанне ўрыўкаў з твораў;
- Валынец Н. І. падрыхтавала паведамленне аб адкрыцці музея у Ждановічах.

*Дзівінская СБ, 36 чал.*

**22 чэрвеня**

У Імянінскай с / б прайшло свята кнігі, чытання, музыкі і песні «Край мой родны, лес мой вечныя», прысвечанае 495-годдзю в Імяніны.

У праграме свята: выступленне літаратурна-паэтычнай групы бібліятэкі, відэапрэзентацыя «Сваей вёскай ганаруся», конкурсы і віктарыны, ушанаванне самых актыўных чытачоў бібліятэкі, розныя выставы.

З канцэртнай праграмай выступілі педагогі Імянінской музычнай школы пад кіраўніцтвам дырэктара Татолінай Т. П.

На мерапрыемстве прысутнічалі старшыня Буховіцкага сельскага Савета Лаўрысюк Сяргей Паўлавіч, дырэктар "Агра- Кобрын" Селівейстраў Сяргей Дзмітрыевіч.

*Імянінская СБ, 50 чал.*

**23 чэрвеня**

У Батчынскай бібліятэцы адбыўся ўрок мужнасці, прысвечаны Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны "Трывожны сорак першы". Удзельнікі сустрэчы пазнаёміліся з выставай кніг "В их детство ворвалась война", якая была дапоўнена прэзентацыяй па гэтай тэме і выступленнем бібліятэкара. Удзельнікі мерапрыемства прынялі ўдзел у віктарыне "Вучуся ў герояў Айчыну любіць", у якой лепшымі сталі: Асійчук Аксана, Бушчук Ксенія, Бенядзісюк Іван, Сальянчук Марына.

*Батчынская СБ, 15 чал.*

Выканаўца: Мілашук Т. І.
аддзел маркетынгу